# Рухі жыцця

***У чым адметнасць V Рэспубліканскага конкурсу харэаграфічнага мастацтва «Час танцаваць»?***



*Фота БелТА.*

…Адзін за адным на сцэну канцэртнай залы «Мінск» выходзілі людзі і паказвалі свае нумары з раніцы да позняга вечара. Яны прыехалі з розных рэгіёнаў – не дзеля канкурэнцыі, а дзеля таго, каб даць выхад сваёй энергіі і апантанасці, убачыць, што робяць іншыя, хто падзяляе той жа інтарэс. І не толькі да танцаў, бо такім чынам выявілася захапленне жыццём – і зусім маленькіх танцораў, якія толькі спасцігаюць свет, і людзей, якія найлепш за іншых разумеюць каштоўнасць кожнага імгнення. Тут няма ўзроставага абмежавання і не трэба быць прафесіяналам, каб паўдзельнічаць. Трэба проста любіць жыццё, сутнасць якога – у няспынным руху.

**Заканчэнне на стар. 5** ▸

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 26014

## *У чым адметнасць V Рэспубліканскага конкурсу харэаграфічнага мастацтва «Час танцаваць»?*

### РУХ ПА ГАРЫЗАНТАЛІ

Народны танец звычайна дорыць самыя яскравыя эмоцыі, увасабляючы прыгажосць і ўзнёсласць, услаўляючы беларускія традыцыі, абрады і сімвалы нашай культуры. Звычайна шмат заявак менавіта ў гэтай намінацыі. Але і «Сучасны танец», як высвятляецца, прыцягвае ўсё больш зацікаўленых: праз яго можна ўздымаць самыя актуальныя тэмы, што хвалююць людзей у наш час, бо цела – цудоўны сродак выяўлення. На гэтым зрабіла акцэнт падчас аднаго з майстар-класаў Сабіна Мунасыпава, выкладчыца кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Да яе на сцэну выйшлі ахвотныя праверыць сябе ў руху – і былі шчаслівыя рабіць нешта разам, не зважаючы на прыналежнасць да розных калектываў і танцавальных кірункаў.



*Аляксандр Сідарэнка.*

Сёлета канкурэнцыя была сур'ёзная. Колькасць удзельнікаў адборачных тураў адкрытага рэспубліканскага конкурсу «Час танцаваць» перасягнула 2000. У фінальны тур эксперты дапусцілі 115 з 277 прэтэндэнтаў. «Гэта найбольшая колькасць заявак за пяцігадовую гісторыю конкурсу. Калі параўноўваць з папярэднімі гадамі, то колькасць удзельнікаў узрасла практычна ўдвая, – адзначыў дырэктар Рэспубліканскага культурна-асветнага цэнтра Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Сідарэнка. – Былі ўдзельнікі з Расійскай Федэрацыі, але мы падкрэсліваем: гэта конкурс рэспубліканскі, ён такім і застанецца». Пры гэтым арганізатары ўжо разумеюць неабходнасць яго перафарматаваць, каб можна было паказаць паўнавартасны Гала-канцэрт з найлепшых нумароў…

### РУХ ПА ВЕРТЫКАЛІ

У намінацыі «Класічны танец» перамог Павел Красоўскі, які з варыяцыяй з балета «Чыпаліна» прадстаўляў Беларускую дзяржаўную харэаграфічную гімназію-каледж – дзе ж яшчэ набіраюцца майстэрства будучыя артысты балета? Пры тым, што гэтага маладога чалавека можна было бачыць і ў зусім іншым нумары, іншага калектыву.

Намінацыя «Бальны танец», напэўна, найбольш прыцягвае ўдзельнікаў самых розных узростаў, у тым ліку вельмі сталых людзей (пра гэта сведчаць назвы калектываў «Залаты ўзрост», «Сярэбраны век», «Сонечныя лэдзі»). Але ёсць калектывы, досвед якіх вымяраецца дзесяцігоддзямі. Адзін з іх – узорны ансамбль бальнага танца «Фіеста» з Баранавічаў, які мае званне заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь. Сёння ў ім развіваюцца розныя кірункі, але конкурс паказаў: найлепш бальныя танцы.

А вось у намінацыі «Народны танец» здарылася неспадзяванка. У Беларусі шмат цікавых дзіцячых калектываў, адкуль часта вырастаюць будучыя ўдзельнікі прафесійных ансамбляў. І вось конкурсны «джокер»: перамога у Тэатра народнай песні і танца Смаленскага дзяржаўнага інстытута мастацтваў. Яго ўдзельнікі – ужо амаль прафесіяналы. Тым больш ганаровымі аказваюцца адзнакі беларусаў. Спецыяльным прызам «За захаванне і развіццё традыцый народнага танца» ўзнагароджаны ўзорны ансамбль «Палясяначка», які прадстаўляе Пінскую дзіцячую школу мастацтваў № 3.

А вось на такіх удзельнікаў, як заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны харэаграфічны ансамбль «Сузор'е» з Салігорска адразу звяртаеш увагу, бо ў яго працы наогул народная сутнасць: у рэпертуары больш за 50 харэаграфічных кампазіцый у розных жанрах. Таму абсалютна зразумела, чаму кіраўнік Вадзім Матанцаў атрымаў ганаровы спецпрыз – «За найлепшую работу балетмайстра» (кампазіцыя «Міхасёвы гульні»), адметна, што балетмайстра адзначылі менавіта ў катэгорыі народных танцаў.

*Вырасла і якасць прадстаўленых нумароў, адзначаюць арганізатары. Таму журы пад старшынствам прафесара БДУКіМ Святланы Гуткоўскай не толькі размяркоўвала месцы ў кожнай з намінацый — між іншым, лаўрэатаў трэцяй, другой альбо першай ступені было адразу некалькі, але і шчодра раздавала дыпломы ўдзельнікам. Сёлета ва ўсіх была магчымасць сачыць за вынікамі галасавання. І адразу можна было разважаць: а чаму такія адзнакі, чым адметныя тэхніка, вобраз, характар танца?.. Гэта здымала і ўсе пытанні наконт пераможцаў (якія атрымалі па 20 базавых велічынь): можна было зразумець, за што даюць найбольшую колькасць балаў.*



У намінацыі «Эстрадны танец» пераможцам стаў узорны ансамбль «Папараць-кветка» са Слуцка. Напрыклад, крануў нумар пад назвай «Абярэг». І няма чаго здзіўляцца, што калектыў быў адзначаны новым спецыяльным прызам – «За ўвасабленне ў танцы вобраза беларускай жанчыны». Мовай танца можна даносіць глыбокі сэнс.



### РУХ У ГЛЫБІНЮ

Доказ таму – сёлетні пераможца ў намінацыі «Сучасны танец» і ўладальнік Гран-пры.

Найбольш нумароў у фінальнай частцы было ад мінскай дзіцячай студыі *Smart Dance* – ажно 12 кампазіцый! Калектыў, заснавальніцай і кіраўніцай якога з'яўляецца некалі славутая гімнастка, а цяпер паспяховы харэограф Аляксандра Буяльская, раней не ўдзельнічаў у конкурсе, але з першага разу апынуўся ў фаварытах. За некаторыя нумары ўсе члены журы паставілі па «10» балаў! Кампазіцыі былі розныя – ад гарэзлівых («Блазны») да прыгожа-пластычных («Дыхай, усплывай»), скіраваных у свет псіхалогіі (напрыклад, сольны нумар "Самасвядомасць») ці глыбока філасофскіх («Ён іншы»). Наогул, у *Smart Dance* юных удзельнікаў вучаць не проста рабіць пэўныя рухі пад музыку, а разглядаюць танец як спосаб самавыяўлення і асэнсавання пэўных з'яў жыцця.

Для Аляксандры Буяльскай і яе юных выхаванцаў (гэта дзеці дзвюх узроставых груп) сэнс, змест або сюжэт – заўсёды на першым месцы, з дапамогай цела яны з ранніх гадоў вучацца расказваць складаныя гісторыі. Напрыклад, варта згадаць паўнавартасны харэаграфічны спектакль "Абуджэнне спячай прыгажуні", створаны на музыку Чайкоўскага. Ажыццявіць такія пастаноўкі з дзецьмі – справа складаная і затратная. Сума ў 200 базавых велічынь за Гран-пры ў конкурсе «Час танцаваць» дапаможа ўвасобіць мары…

– Думаю, што Гран-пры нам прысудзілі за ўсе нашы заслугі ў комплексе, за тое, як мы сябе паказалі на конкурсе. Такіх вынікаў дзеці дабіваюцца, прыкладваючы шмат намаганняў. Яны вялікія працаўнікі і вельмі таленавітыя, – адзначыла Аляксандра Буяльская. – Для нашага калектыву сума, якую мы атрымаем, істотная. Гэта, мабыць, адзіны конкурс, які дае такія вялікія грашовыя ўзнагароды, што дапаможа нам ажыццявіць пастаноўку яшчэ аднаго дзіцячага балета.

**Ларыса ЦІМОШЫК**
**Фота БелТА**




**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**